# ПРАЦАВАЦЬ НА КАНКРЭТНЫ ВЫНІК

**Прэзідэнт разгледзеў кадравыя пытанні**

**Аляксандр Лукашэнка назначыў:**

ЛАЗАРЧЫКА Юрыя Іванавіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Ісламскай Рэспубліцы Іран;

ПАПКОВА Андрэя Мікалаевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Карэя;

МІХНЕВІЧА Аляксандра Юр'евіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Бельгія, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Еўрапейскім саюзе і Еўрапейскім супольнасцце па атамнай энергіі, пастаянным прадстаўніком Рэспублікі Беларусь пры Арганізацыі Паўночнаатлантычнага дагавора па сумяшчальніцтве, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Вялікім Герцагстве Люксембург па сумяшчальніцтве;

ЛЯШЧЭНЮ Ігара Аляксандравіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Славацкай Рэспубліцы;

ГОШЫНА Уладзіміра Анатолевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Сацыялістычнай Рэспубліцы В'етнам, Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Каралеўстве Камбоджа па сумяшчальніцтве;

СОКАЛА Ігара Сяргеевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь ва Украіне;

ЦАРКОЎСКАГА Аляксандра Пятровіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Федэратыўнай Рэспубліцы Бразілія;

КУПТЭЛЯ Дзмітрыя Георгіевіча — Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Уганда па сумяшчальніцтве;

СМОЛЬСКАГА Генадзя Аляксандравіча — намеснікам старшыні Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта.

**Прэзідэнт таксама даў згоду на назначэнне:**

МАРТЫНЮКА Леаніда Аляксеевіча — старшынёй Бярозаўскага райвыканкама;

ГАПОНІКА Анатоля Генрыкавіча — старшынёй Лельчыцкага райвыканкама;

ДЗМІТРОВА Сяргея Мікалаевіча — старшынёй Лоеўскага райвыканкама;

ДУБОВІКА Аляксандра Міхайлавіча — старшынёй Дзятлаўскага райвыканкама;

ВАЛЯВАТАГА Юрыя Мікалаевіча — старшынёй Мастоўскага райвыканкама;

АСТРЭЙКІ Мікалая Анатолевіча — старшынёй Валожынскага райвыканкама;

ГАБРУКЕВІЧА Аляксандра Вацлававіча — старшынёй Старадарожскага райвыканкама;

КУЛАЖАНКІ Андрэя Рыгоравіча — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Мюнхене (Федэратыўная Рэспубліка Германія);

ЧАХЛОВА Уладзіміра Уладзіміравіча — генеральным консулам Рэспублікі Беларусь у г. Адэса (Украіна);

ДЗЕМЧАНКІ Міхаіла Дзмітрыевіча — дырэктарам адкрытага акцыянернага таварыства «АГАТ — сістэмы кіравання» — кіруючая кампанія холдынга «Геаінфармацыйныя сістэмы кіравання»;

КУЗНЯЦОВА Андрэя Аляксандравіча — рэктарам установы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»;

ХАХОМАВА Сяргея Анатолевіча — рэктарам установы адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»;

ЕЎДАЧЭНКІ Андрэя Аляксандравіча — першым намеснікам міністра замежных спраў;

ЖУКАВАЙ Наталлі Паўлаўны — намеснікам міністра аховы здароўя — галоўным дзяржаўным санітарным урачом Рэспублікі Беларусь;

РАБАВОЛАВА Уладзіміра Анатолевіча — намеснікам міністра інфармацыі;

ЧАБАТАРА Юрыя Адамавіча — намеснікам міністра эканомікі;

ПЯРМІНАВАЙ Алены Аляксандраўны — дырэктарам дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму;

ГНІЦІЯ Вячаслава Анатолевіча — генеральным дырэктарам гандлёва-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «БЕЛФАРМАЦЫЯ»;

НАРКЕВІЧА Юрыя Іосіфавіча — кіраўніком спраў Брэсцкага аблвыканкама.

Прымаючы рашэнне аб кадравых прызначэннях сярод кіраўніцтва мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў не дапускаць пераходу кіраўнікоў з адной адказнай пасады на іншую ў выпадку іх нездавальняючай працы на ранейшым месцы. «Не здолеў, значыць, трэба ісці працаваць па спецыяльнасці. Гэта павінна тычыцца ўсіх», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

У той жа час, паводле слоў Прэзідэнта, добрых кіраўнікоў трэба вельмі сур'ёзна падтрымліваць, асабліва старшыняў райвыканкамаў. «Вельмі разлічваю і спадзяюся, што мы зможам справіцца з тымі выклікамі, якія кінуў нам час. Мы проста абавязаны справіцца. Іншага шляху ў нас няма, — сказаў Прэзідэнт. — Нікога не слухайце, што нешта сёння немагчыма зрабіць. У наш час магчыма зрабіць усё, калі толькі захацець. А калі апусціць рукі і плакаца, што ў нас крызіс (перачакаем яго ці ўвогуле нічога рабіць не будзем, пакуль ён не скончыцца), ведаеце, што будзе ў выніку».

Што тычыцца паслоў, то эфектыўнасць іх працы будзе ў першую чаргу ацэньваца з пункту гледжання развіцця гандлёва-эканамічных сувязяў з канкрэтнымі краінамі і рэгіёнамі. «Галоўнае — эканоміка, экспарт. Перш за ўсё па гэтых пытаннях мы будзем вас ацэньваць. Мы не ставім перад вамі нейкіх глабальных невырашальных задач. Кожны год патроху, але дадавайце», — сказаў кіраўнік дзяржавы, звярнуўшы пры гэтым увагу на неабходнасць наяўнасці выразнай зваротнай сувязі. «Калі пасол патрабуе нешта ад міністра, значыць, трэба ўзяць на кантроль і прымусіць міністэрства і канкрэтнае прадпрыемства ў гэтым кірунку працаваць. Толькі я хачу перасцерагчы ад усякай непатрэбнай пісаніны. Павінны быць канкрэтныя дзелавыя прапановы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Узгадняючы прызначэнне рэктараў ВНУ, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што разумная моладзь з'яўляецца вялікім патэнцыялам Беларусі, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта.

# ГОДНАЕ МЕСЦА «РЭСПУБЛІКІ»

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў газеты «Рэспубліка» з 25-годдзем з дня выхаду першага нумара, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

«За чвэрць стагоддзя вашаму выданню ўдалося заняць годнае месца ў інфармацыйнай прасторы краіны і заваяваць папулярнасць сярод чытачоў розных узростаў і прафесій», — гаворыцца ў віншаванні. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што уласцівыя калектыву газеты прафесіяналізм і пастаянны журналісцкі пошук з'яўляюцца залогам далейшай плённай працы. Аляксандр Лукашэнка пажадаў супрацоўнікам рэдакцыі і аўтарскаму актыву газеты натхнення, цікавых публікацый, пашырэння чытацкай аўдыторыі і новых поспехаў на карысць роднай Беларусі.

■ Ва ўрадзе

# КЛАСТАР ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Германія з'яўляецца для Беларусі адным з ключавых замежных партнёраў. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Андрэй Кабякоў падчас сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом ФРГ у Рэспубліцы Беларусь Петэрам Дэтмарам, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Андрэй Кабякоў звярнуў увагу, што складваецца ўнікальная магчымасць вывесці адносіны паміж нашымі дзяржавамі на якасна новы ўзровень. «Спадзяёмся на далейшую падтрымку нашых намаганняў па ліквідацыі любых перашкод для актывізацыі крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва Беларусі з Германіяй і іншымі краінамі — членамі ЕС» — падкрэсліў ён. Прэм'ер-міністр выказаў зацікаўленасць у выкарыстанні існуючых інструментаў фінансавай і тэхнічнай дапамогі Еўрасаюза і ФРГ, а таксама патэнцыялу «Усходняга партнёрства» для стабілізацыі і развіцця беларускай эканомікі. «Асаблівае значэнне мы надаём рабоце па павышэнні крэдытнага рэйтынгу нашай краіны па класіфікацыі АЭСР», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Прэм'ер-міністр Беларусі запрасіў германскіх інвестараў у першую чаргу ў тыя сферы, у якіх яны з'яўляюцца прызнанымі лідарамі, — у машына- і аўтамабілебудаванне, у хімічную і нафтахімічную галіну, энергетыку, сферу высокіх тэхналогій. «Прапануем разгледзець магчымасць стварэння ў Беларусі высокатэхналагічнага вытворчага кластара германскіх прадпрыемстваў, напрыклад у індустрыяльным парку «Вялікі камень», — адзначыў прэм'ер-міністр. Кіраўнік урада выказаў упэўненасць, што неабходны новыя формы эканамічнага ўзаемадзеяння, якія спрыялі б аднаўленню і нарошчванню аб'ёму двухбаковага гандлю, паляпшэнню яго балансу, прыцягненню германскіх тэхналогій і інвестыцый у нашу краіну, таксама ўлічваючы інтэграцыйныя працэсы ў рамках ЕАЭС. «Адной з такіх формаў магла б стаць больш глыбокая прамысловая кааперацыя паміж беларускімі і германскімі прадпрыемствамі. Беларускія партнёры маглі б узяць на сябе ролю пастаўшчыкоў прамысловых паўфабрыкатаў і камплектуючых», — адзначыў Андрэй Кабякоў.

Таксама Прэм'ер-міністр выказаў упэўненасць, што значную ролю ў развіцці беларуска-германскага эканамічнага супрацоўніцтва адыгрываюць адпаведныя інстытуцыйныя механізмы. «Мы задаволены паспяховым функцыянаваннем Беларуска-Германскай рабочай групы па гандлі і інвестыцыях, а таксама Дзелавога савета «Беларусь — Саксонія». Разлічваем на практычныя крокі германскага боку па аднаўленні работы Беларуска-Германскай рабочай групы па навукова-тэхнічным супрацоўніцтве, а таксама Беларуска-Германскага савета дзелавога супрацоўніцтва», — падкрэсліў ён.

У сваю чаргу Петэр Дэтмар падзякаваў Андрэю Кабякову за такую ацэнку двухбаковага супрацоўніцтва. Паводле яго слоў, патэнцыял гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння паміж краінамі не вычарпаны.

# Раённая гімназія — у вёсцы

**На Усебеларускім народным сходзе Шуміліншчыну будзе прадстаўляць і Ларыса МАЛАДЗЕЧКІНА, дырэктар раённай гімназіі-інтэрната — адной з лепшых у вобласці. Адметна, што ўзорная ўстанова адукацыі знаходзіцца не ў райцэнтры, а ў вёсцы Лескавічы.**



## У дзясятцы лепшых

Гімназія створаная на базе былога санаторыя-інтэрната ў 2005 годзе. У гэтай установе былі добрыя ўмовы, у тым ліку і для пражывання дзяцей. Таму пры вызначэнні, дзе адкрыць раённую гімназію, выбралі менавіта Лескавічы, — расказвае Ларыса Маладзечкіна.

Яна — старшыня раённай арганізацыі РГА «Белая Русь», дэпутат Шумілінскага райсавета дэпутатаў.

Гімназія — яскравы прыклад таго, што і ў глыбінцы можна паспяхова рыхтаваць дзяцей да вышэйшай адукацыі. Станоўчы вынік пацверджаны высокім паказчыкам паступлення выпускнікоў у акадэміі і ўніверсітэты.

— Практычна штогод адпаведная лічба не мяняецца: 93% нашых выпускнікоў паступаюць у ВНУ. Паказчык мог быць і большым. Проста, бывае, патэнцыйны абітурыент не хоча атрымліваць вышэйшую адукацыю. Сярод гімназій Віцебскай вобласці наша — у дзясятцы лепшых. Гімназія ўзнагароджана Ганаровай граматай Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, — працягвае дырэктар.

## Індывідуальны падыход

Усяго ў гімназіі — каля 120 гімназістаў. Іх вучаць больш за 35 педагогаў, 75% з ліку якіх — з першай і вышэйшай катэгорыямі.

— У нас праходзіць апрабацыю рэспубліканскі праект «Укараненне мадэлі суправаджэння інтэлектуальна адоранай моладзі ў працэсе іх прафесійнага станаўлення». Ён рэалізуецца прыкладна ў 20 школах краіны і накіраваны на выяўленне схільнасцяў і здольнасцяў вучня. Выкарыстоўваюцца тэсты, псіхалагічная дыягностыка. Наша задача — на працягу вучэбнага года выяўленыя здольнасці развіць, — тлумачыць суразмоўца.

Летась такім чынам педагогі індывідуальна працавалі па «паглыбленай» праграме з 16 гімназістамі. Яны і іншыя — пастаянныя ўдзельнікі алімпіяд па вучэбных прадметах. Каля 30 сталі пераможцамі другога этапу рэспубліканскай алімпіяды. Усяго ў скарбонцы гімназіі каля 160 прызавых месцаў.

У бліжэйшых планах — далейшая інфарматызацыя навучання. Больш шырока будуць прымяняцца сучасныя адукацыйныя праграмы.

Як дэлегата V Усебеларускага народнага сходу Ларысу Уладзіміраўну, зразумела, вельмі цікавіць тэма адукацыі. Прэзідэнт краіны аднойчы адзначыў, што хацелася, каб сучасная школа была школай радасці, «дзе дзеці вучацца з інтарэсам і захапленнем, без страха, перагрузак і стрэсаў». Пад гэтым, можна сказаць, дэвізам і працуе гімназія ў глыбінцы.

## «Зялёная школа»

У гімназіі ўсе вучні наведваюць пасля заняткаў гурткі і факультатывы. Вельмі папулярны экалагічны кірунак. Любоў да прыроды прывівае дзятве **педагог дадатковай адукацыі, кіраўнік аб'яднання па інтарэсах «Зялёная школа» Ірына КУЛІКОВА.**

— Гімназія пасля задавальнення адпаведнай заяўкі ўключылі ў міжнародную сетку «Зялёных школ». Яна дзейнічае ў 120 краінах свету. А ў нашай — гэта прыкладна 200 школ, — гаворыць эколаг.

Яе вучні даследавалі біяразнастайнасць навакольнага асяроддзя і выявілі чужародных культурных віды.

— Зрабілі выснову, што іх у нас усяго тры: белая акацыя, елка блакітная і туя... Мы купілі шраг дрэў і хмызнякоў дэкаратыўных і пасадзілі, каб дзеці маглі бачыць разнастайнасць дзікіх відаў і ў культуры, — працягвае Ірына Кулікова.

Яшчэ за навучальны год лескавіцкія гімназісты сабралі 5-літровую «ёмістасць» батарэек, каб здаць для перапрацоўкі.

Умеюць дзеці і эканоміць ваду. Трэба было вывучыць, наколькі абгрунтаваная колькасць яе спажывання дома, прааналізаваць і паменшыць. І ў школе таксама вучні даюць парады адміністрацыі, як сэканоміць на аплаце водакарыстання. Некаторыя з атрыманых дзецьмі ў ходзе назірання звестак ужо выкарыстоўваюцца. Гімназія можа стаць першай у раёне ўстановай, дзе плануюць усталяваць сонечны калектар для падагрэву вады.

Такім чынам, і па экалагічнай дзейнасці вясковая гімназія можа даць фору не толькі гарадскім, але і сталічным.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Шумілінскі раён — Віцебск.*

# ДА НАС ІДЗЕ СПЯКОТА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Толькі па поўдні пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад плюс 19 да плюс 25 градусаў. Кардынальная змена надвор'я чакаецца ў сераду, калі ў нас пачнуць сваволіць актыўныя атмасферныя франты, якія прынясуць у краіну кароткачасовыя дажджы, месцамі моцныя лііўні і навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе 10—17 цяпла, удзень — ад 18 да 24, а месцамі да плюс 26 градусаў.

Амаль не зменіцца надвор'е і ў чацвер, калі мы застанёмся ў зоне вільготных і цёплых паветраных мас чарнаморскага паходжання. Амаль паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі навальніцы. Удзень у асобных раёнах моцныя дажджы і магчымы град. Уначы стане ўвогуле камфортна для агуркоў, калі прагназуецца плюс 12—18 градусаў, а ўдзень — плюс 20—27.

А гарачыня завітае да нас ужо ў пятніцу. Тады з поўдня Францыі на краіны Балтыі будзе перамяшчацца цыклон, які вынесе вельмі цёплае паветра субтрапічнага паходжання. Уначы месцамі, а ўдзень пераважна па паўночна-заходняй палове пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Удзень у асобных раёнах чакаюцца моцныя дажджы, магчымы град, а пры навальніцах прагназуецца ўзмацненне ветру да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—19 градусаў, а ўдзень будзе да 24 да 30 цяпла, па поўдні краіны да плюс 31—33 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, высокі тэмпературны фон у нас захаваецца і ў выхадныя дні. Чакаецца, што ў суботу ўначы паўсюдна і месцамі ўдзень пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. У асобных раёнах парывы ветру будуць дасягаць 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 12—19 градусаў, а па паўднёвым усходзе назват да 20—22 цяпла. Удзень будзе плюс 22—28 градусаў, а па паўднёвым усходзе да 30 градусаў. Сіноптыкі адзначаюць, што такі тэмпературны фон у першай палове чэрвеня перавышае норму на 4-6 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*